Источник: "Народная воля" - 2018-04-27

НОУ-ХАУ

# Беларускі электрамабіль прэміум-класа

*Вучоныя і спецыялісты Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі працуюць над стварэннем некалькіх тыпаў беларускіх электрамабіляў. Пра гэта паведаміў старшыня прэзідыума НАНБ* ***Уладзімір Гусакоў****.*

*«У мінулым годзе мы паказалі прыкладную мадэль электрамабіля, цяпер мы працуем над цалкам беларускім узорам электрамабіля,* – цытуе чыноўніка БелаПАН. – *Мы плануем стварэнне аўтамабіля не толькі аднаго нейкага тыпу, а адпрацоўваем электрамабілі прадстаўніцкага, сярэдняга класа і вельмі даступнага па цэнах для шырокіх слаёў насельніцтва, дарэчы, зручнага ў выкарыстанні. Ставім задачу, каб усё ў электрамабілі было нашым. Паколькі ў нас ёсць добрыя напрацоўкі па матэрыялах, у тым ліку па кампазіцыйных, мы сёння гатовы зрабіць і свой кузаў. Але гэта таксама вельмі складаны элемент аўтамабіля. Патрабуецца штампоўка, зварка або злучэнні, мы прапрацоўваем гэтыя пытанні»*, – адзначыў Гусакоў.

Кіраўнік Нацыянальнай акадэміі навук нагадаў, што А.Лукашэнка паставіў перад навукоўцамі задачу скончыць распрацоўку электрамабіля ў гэтым годзе.

*«Мы ўжо трошкі турбуемся, каб нам укласціся ў гэты тэрмін. Але мы імкнёмся не падарваць давер кіраўніка дзяржавы і ўрада, таму павінны ўкласціся ў тэрміны»*, – сказаў ён.

Пытанне аб серыйнай вытворчасці беларускіх электрамабіляў пакуль ніхто не разглядае, сказаў навуковец. Паводле яго слоў, *«спачатку трэба яго распрацаваць і даказаць яго эфектыўнасць і перавагі»*. Калі электрамабіль *«па сваіх тэхнічных характарыстыках не будзе саступаць замежным аналагам»*, тады будзе ставіцца пытанне аб яго серыйнай вытворчасці, таму цяпер супрацоўнікі Акадэміі навук *"дамагаюцца, каб ён быў канкурэнтным"*.

Калі ж справа дойдзе да серыйнай вытворчасці, сказаў Гусакоў, то трэба будзе думаць альбо аб будаўніцтве новага завода, альбо аб стварэнні асобнай лініі на якім-небудзь дзейным прадпрыемстве, напрыклад «БелДжы». *«Але гэта пытанне наступнага парадку»*, – падкрэсліў Гусакоў.